Альховік, М. К. Польскі Дзяржынскі раён: «вітрына сацыялізму» ці правакацыя УКП(б) / М. К. Альховік // Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI в.: материалы междунар. науч.-практ. конф. / редкол. : Т. А. Новогродский (отв. ред.) [и др.]. — Минск: БГУ, 2011. — С. 149 – 153

**М. К. АЛЬХОВІК**

# ПОЛЬСКІ ДЗЯРЖЫНСКІ РАЁН: «ВІТРЫНА САЦЫЯЛІЗМУ» ЦІ ПРАВАКАЦЫЯ УКП(Б)

У Савецкай Беларусі ў міжваенны перыяд кожная нацыянальная супольнасць валодала адмысловым палітычным статусам. Апошні ўплываў непасрэдна на палітыку дзяржавы адносна этнічных групаў. У польскай нацыянальнай меншыні была ўласная метраполія – другая Рэч Паспалітая з варожым Саюзу ССР дзяржаўным ладам і агрэсіўнай настроенасцю да тэрытарыяльнай цэласнасці Савецкага Саюза. Гэта і было прычынай «адмысловага» стаўлення Савецкай дзяржавы да польскай нацыянальнасці ў СССР і БССР у прыватнасці.

Гісторыя ўтварэння і ліквідацыі адзінага на Беларусі польскага раёна – Дзяржынскага – здаецца пазбаўленай логікі. Ён быў адкрыты з вялікай помпай і мусіў служыць рэвалюцыйным мэтам, быць «вітрынай сацыялізму» (чытай: нацыянальнай палітыкі СССР). У раённым цэнтры на плошчы ўзвялі манумент Дзяржынскаму. Праз пяць гадоў гісторыя была перапісана на новы капыл: раён аказаўся варотамі, праз якія інфільтраваліся ў СССР польскія дыверсійныя групоўкі.

Праблема навучання беларусаў-каталікоў у польскіх школах БССР не была знята ў гады славутай беларусізацыі 1920-х – пачатку 1930-х гг. Яшчэ ў 1924–1925 гг. Народны камісарыят асветы БССР уводзіў польскую мову і арганізоўваў польскія школы там, дзе ёсць хоць бы невялікая колькасць палякаў. У 1931 г. камісарыят спрабаваў падвергнуць рэвізіі гэты імператыў, але запярэчылі старшыня нацкамісіі Вансоўскі і рэдактар польскай газеты «Трыбуна Радзецка» [3, с. 105].

«*Выбары*» *польскага раёна.* На пленумах ЦК КП(б) Б ад 3 жніўня 1934 г. і 30 студзеня 1937 г. усё было расстаўлена па паліцах. Намеснік рэдактара «Трибуны Радзецкай» звярнуўся ў ЦВК БССР аб неабходнасці арганізацыі ў Беларусі польскага раёна. Пытанне абмяркоўвалася ў ЦВК БССР і ЦК КП(б)Б. Аднак такім раёнам стаў не прапанаваны Плешчаніцкі, а Койданаўскі. ЦК КП(б)Б звярнуўся ў ЦВК БССР па ідэалагічнае абгрунтаванне пераўтварэння беларускага раёна ў



польскі: работнікам апошняга Клысу і Вансоўскаму належала сфальсіфікаваць колькасць польскага насельніцтва за кошт далучэння беларускіх каталікоў да палякаў. У выніку прадстаўнікі КП(б)Б давялі лічбы польскага насельніцтва да 49,4 % і звярнуліся да ЦК УКП(б) з хадайніцтвам аб тым, каб зрабіць Дзяржынскі раён нацыянальным польскім.

*Мэты ўтварэння Дзяржынскага раёна.* На XVI з'ездзе КП(б)Б (1937) выплылі факты, якія раскрывалі інтэнцыі пераўтварэння беларускага Койданаўскага раёна ў польскі Дзяржынскі. Аказалася, што ў «…Бюро ЦК лічылі палітычна мэтазгодным стварaць польскі раён для таго, каб супаставіць работу і жыццё польскага раёна таму прыгнечанню, якое адбывалася ў Польшчы над польскімі і беларускімі сялянамі… мы ведалі, што ў Койданаўскім раёне палякі не складалі большыні. Мы ў бюро ЦК дамовіліся…» [4, с. 240]. Ідэалагічная лаяльнасць праявілася і ў факце перайменавання раёна ў гонар заснавальніка савецкіх спецслужб Ф. Э. Дзяржынскага. М. Галадзед на Пленуме ЦК КП(б)Б ад 3 жніўня 1934 г. адзначыў са скрухай, што хібы былі ў тым, што ўтварэнне раёна не было спалучана з палітычнай, інтэрнацыянальнай работай.

*Паланізацыя Дзяржынскага раёна* (*1932–1934*). У свядомасці многіх беларускіх камуністаў, асабліва моцна звязаных з Масквой, замацаваўся тэзіс, спушчаны ЦК УКП(б), аб татальнай дамінацыі польскіх школ у раёне. Прыкладна гэтак жа меркавалі відавочцы. С. Кандыбовіч зазначае, што ў нацыянальным раёне ўсчалося прымусовае і незразумелае насаджэнне польскай мовы, што ўсе ўстановы, школы, хаты-чытальні, райгазета былі пераведзеныя на польскую мову. Што ж было насамрэч?

У 1932 г. Дзяржынская нацыянальная камісія працавала слаба, сакратара не было 6 месяцаў. У час Кастрычніцкіх святкаванняў у 1932 г. на ўрачыстым вечары ў Навасёлкаўскім сельскім савеце ў нацыянальнай школе група польскіх дзяцей пачала спяваць на польскай мове. Настаўнік Ярына катэгарычна забараніў пець на польскай мове, гаварыць на польскай мове ў сценах школы [1, с. 23].

З 6 памежных сельсаветаў Койданаўшчыны 5 былі нацыянальна-польскімі. Аднак справаводства ў гэтых пяці нацыянальна-польскіх саветах у 1933 г. вялося на беларускай мове. Каранізацыяй апарату гэтых сельсаветаў ніхто не займаўся. З 5 нацыянальна-польскіх сельсаветаў толькі ў двух у 1933 г. былі старшыні-палякі. Ні ў якім сельсавеце сакратара-паляка не было [2, с. 77]. У 1934 г. у Дзяржынскім раёне выходзяць дзве газеты: адна на польскай, другая на беларускай мове.

У 1934 г. у Дзяржынскім раёне сярод 96 школаў 22 былі польскімі, 50 – беларускімі, 14 – змешанымі, 1 – габрэйскай і 1 – расейскай. З агульнай колькасці вучняў па раёне ў 7890 вучняў у польскіх школах навучалася 32 % дзяцей (2588 чал.), у беларускіх – 62 %, у габрэйскіх – 5 %.

*Першы этап дэпаланізацыі Дзяржынскага раёна* (*1934–1936*). Пры правядзенні пашпартызацыі насельніцтва раёна колькасць палякаў апынулася непараўнальнай з дадзенымі, прыведзенымі беларускімі камуністамі. Таму апошнім у 1934 г. Цэнтральным Камітэтам УКП(б) было ўказана на «няправільную палітыку і практыку насаджэння ў раёнах і сёлах з большынёй беларускага насельніцтва польскіх школ і



прымусовага навучання дзяцей на польскай мове». Гэтае рашэнне апраўдвалася «клопатамі» пра беларусаў: «перагледзець сетку і нацыянальны характар школ у дусе найбольшага забеспячэння інтарэсаў беларускае мовы». На спецыяльныя даручыны І. В. Сталіна ў Дзяржынскі раён прыехаў намеснік культпропа Хавінсан абследаваць пытанне насаджэння польскай мовы і школ. Раён быў літаральна наводнены дзясяткамі правяральшчыкаў: інспектара Наркамасветы, загадчыкі РайАНА, раённыя партработнікі. [3, с. 13]. Беларускія камуністы з 1934 па 1936 прыняліся выконваць указанні ЦК УКП(б). Галадзед на Пленуме ЦК КП(б)Б ад 3 жніўня 1934 г. адзначыў, што не выключана, «што польскія «шпікі», можа быць, спецыяльна працуюць па паланізацыі школ». Сярод галоўных памылак былі артыкуляваны наступныя:

- Блытаніна рэлігіі і нацыянальнасці. Камуністы раптам усведамілі, што «[польскую] мову ў польскіх школах выкладаюць паводле прыкметы веравызнання», што «палякі» польскай мовы ў большыні не ведаюць. У якасці паўмеры Народны камісарыят асветы прыняў рашэнне аб арганізацыі на Койданаўшчыне польска-беларускіх школ, калі ў адной школе частка дзяцей вучыцца на беларускай мове, частка на польскай;
- *Дасыланне беларусаў у польскія школы*. У Дзяржынскім раёне па 17–20 чалавек вучыцца ў польскіх школах, нягледзячы на тое, што ў 1,5–2 км. ад польскай школы ёсць беларуская школа. У польскай школе ў в. Негарэлае з 35 вучняў палякамі былі толькі чатыры. Паблізу беларускіх школ не было;
- *Выкладанне польскай мовы ў шэрагу беларускіх школаў, там дзе ў наяўнасці невялікая колькасць польскіх дзяцей*. У Станькаўскім сельсавеце ў адной школе вучылася 125 чал., з іх толькі 15 былі палякамі па нацыянальнасці, польская мова выкладаецца па ўсёй школе як абавязковы прадмет. Былы прадстаўнік Дзяржынскага РВК Клыс прымусіў загадчыкаў РайАНА ўвесці польскую мову ва ўсіх беларускіх школах Койданаўшчыны. Загадчык РайАНА выканаць гэтае дырэктывы не змог толькі таму, што ў яго не знайшлося столькі настаўнікаў, што ведалі польскую мову, для таго, каб можна было выкладаць у беларускіх школах. У выніку ў шэрагу школаў польская мова выкладалася не толькі для палякаў, а й для беларусаў. Для многіх каталікоў польская мова была патрэбна выключна для прачытання рэлігійнай літаратуры. Для вырашэння гэтай праблемы Народны камісарыят асветы ў 1934 г. выдаў загад аб абмежаванні выкладання польскай мовы толькі польскімі і змяшанымі школамі;
- Для вырашэння пытання аб мове навучання перавага аддавалася побытавай мове сённяшніх пакаленняў насельніцтва, а не мове іх продкаў;
- Быў распаўсюджаны факт, калі да 4 ці 5 класа дзяцей вучылі на беларускай мове, а потым пераводзілі навучанне на польскую мову;
- *У польскіх школах меліся лепшыя матэрыяльныя ўмовы* [6, с. 45]. Беларусы маглі вучыцца ў польскай школе толькі таму, што не мелі блізкай беларускай школы.

У 1936 г. у Дзяржынскім раёне з 50 польскіх школ у 1934 г. засталіся толькі 2. У ананімным допісе ў газету «Звязда» было артыкулявана становішча, у якім апынуліся польскія школы ў 1935/1936–1936/1937 н. г.: «падручнікаў не завозілі, і завозіць напэўна не думаюць. Канкрэтнай дапамогі польская школа ад нацсектара не атрымоўвае… Кіраўніцтва польскімі школамі пастаўлена дрэнна» [5, с. 349]. Аўтар



ліста справядліва адзначыў, што новае кіраўніцтва Народнага камісарыята асветы кінулася садзейнічаць русіфікацыі і беларусізацыі польскіх асветных устаноў.

*Другі этап дэпаланізацыі Дзяржынскага раёна* (*1936–1937*). Прадпрынятых мерапрыемстваў па дэпаланізацыі насельніцтва аказалася недастаткова. У рашэнні ад 24 ліпеня 1936 г. Масква прама ўказала на факт недаацэнкі палітычнай работы ў Беларусі: «Асабліва ЦК УКП(б) адзначае няправільную палітыку і практыку насаджэння ў раёнах і сёлах з большасцю беларускага насельніцтва польскіх школ і прымусовага навучання беларускіх дзяцей на польскай мове» [4, с. 115]. У 1937 г. на паседжаннях кіраўнічых органаў беларускай Кампартыі адкрыта абмяркоўваецца тое, як Дзяржынскі раён стаў цэнтрам польскіх шпіёнаў [6, с. 40–43]. Паланізацыя Койданаўшчыны абвяшчаецца цаной, за якую «агенты дэфензівы» ва ўрадзе БССР куплялі супрацоўніцтва з Польшчай. Перапісванне каталіцкага насельніцтва ў польскае дарага абышлося вядомым беларускім партыйным дзеячам: за агентурную дзейнасць у 1937 г. былі арыштаваны М. Галадзед, В. Шаранговіч і інш. На паседжанні цэнтральнага

бюро КП(б)Б ад 28 ліпеня 1937 г. было прынята рашэнне ліквідаваць польскі раён. Фактычна ён скончыў існаванне ў чэрвені 1937 г. Сымон Кандыбовіч таксама адзначыў, што былі пакараныя і мясцовыя жыхары гэтага раёна і сельсавета – амаль палова насельніцтва апынулася ў Сібіры.

*Паланафобія.* Камуніст Якаўлеў на паседжанні Пленума ЦК КП(б) Б ад 29 ліпеня 1937 г. прапанаваў ліквідаваць польскія саветы і «ўсякага кшталту іншыя цэнтры польскіх шпіёнаў» [6, с. 48], а член ЦК КП(б)Б Волкаў на Пленуме ЦК КП(б)Б ад 17–19 жніўня 1937 г. прапанаваў ліквідаваць польскія школы (пра палякаў ён сказаў: «Ничего, пускай живут, работают, а вредить будут – возьмём на дачу» [7, с. 173]).

Характэрна і тое, што выкарчоўванне паланафільства не прывяло да вяртання раёну і гораду ранейшай назвы.

Як бачым, польскі фактар у адносінах да дадзенага прыгранічнага раёна быў двойчы скарыстаны ў палітычных гульнях афіцыйнай Масквы з Варшавай і беларускім насельніцтвам Заходняй Беларусі. Першы раз – як сродак уздзеяння на Польшчу, другі – з мэтай дыстанцыявання ад яе. Ад штучнага «раздзімання» неіснуючых праблем не выйграла ні польская этнічная супольнасць, ні шматканфесійная карэнная нацыя. Беларускія бальшавікі не ўзгаднілі з ЦК УКП(б) усіх крокаў сваёй дзейнасці па стварэнні польскага раёна, у выніку чаго яны былі пакараныя.

## ЛІТАРАТУРА


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). Ф. 4 п, Воп. 1. Спр. 6343.
2. НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 6352.
3. НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 7125.
4. НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 10917.
5. НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 10924.





6. НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 10959.
7. НАРБ. Ф. 4 п. Воп. 1. Спр. 10963.
8. *Пурышева, Н.* Взаимовлияния белорусской и польской культур в 20–30 годы XX в. / Н. Пурышева // XX стагоддзе ў гісторыі палякаў і беларусаў; адказ. рэд. У. Міхнюк, П. Ганцарэк. – Мінск : БДУ, 2001. – 240 с.